# БЕЛОРУССКОЕ МЕСТЕЧКО КАК ПОЛИКУЛЬТУРНАЯ СРЕДА
# BELARUSIAN TOWN AS A MULTICULTURAL ENVIRONMENT

Маховская Ирина Станиславовна,
Минск, Беларусь

Ключевые слова: Беларусь, местечко, штетл, этнология Беларуси, устная история, полиэтничность, поликультурность, национальные меньшинства, белорусы, евреи, поляки, татары

Резюме. Местечки, известные на территории Беларуси начиная с XIV века, представляют собой особый социокультурный феномен, сыгравший важную роль в истории. Возникшие как торгово-посреднические центры, местечки сочетали черты городского и сельского поселения, основные занятия населения также включали как характерные городские, так и сельские направления деятельности. Для местечек характерна полиэтническая и поликонфессиональная среда. Самыми крупными общинами местечек были еврейские, которые во много определили типичные характеристики местечка. Кроме белорусской и еврейской общины в местечках зачастую проживали польская и татарская. Феномен местечка заключается в организации пространства взаимодействия разных этноконфессиональных групп в рамках малого социума.

Keywords: Belarus, little town, Mir, shtetl, history of Belarus, oral history, multiculturalism, national minorities, Belarusians, Jews, Poles, Tatars.

Summary. The little towns, known on the territory of Belarus since the XIV century, represent a special socio-cultural phenomenon that has played an important role in history. The characteristics of little towns is multi-ethnic and multi-confessional environment. Due to the forcible eviction of Jews from their rural settlements, the largest communities of the townships were Jewish, which mostly determined the typical characteristics of the town. In addition to the Belarusian and Jewish communities, Polish and Tatar communities often

lived in the little towns. The phenomenon of the little town consists in organizing the space of interaction between different ethno-confessional groups within the framework of a small society.

Мястэчкі як форма паселішчаў вядомыя на тэрыторыі Беларусі з XIV - XV стст. Ўзнікаюць яны часцей за ўсё непадалёк ад велікакняжацкіх ці іншых прыватнаўласніцкіх сядзібаў, выконваючы ролю гандлёва-пасрэдніцкіх цэнтраў паміж горадам і вёскай [13, с.97].

Гандаль заўсёды быў вызначальным фактарам развіцця мястэчка, але толькі гэтым роля мястэчка не абмяжоўвалася, аб'яднальная функцыя прасочваецца літаральна ва ўсіх аспектах яго жыццядзейнасці. Гэта не горад у поўнай меры, але і не вёска, у мястэчку спалучаюцца гарадскі і сельскі побыт. Праблема азначэння паняцця "мястэчка" займае значнае месца ў даследаваннях, у якасці вызначальных разглядаюцца розныя характарыстыкі. У першую чаргу адзначаюць такія адрозненні мястэчка ад горада як меншая колькасць насельніцтва, спрошчаная сацыяльная структура. Ад вёскі мястэчка адрозніваецца наяўнасцю стацыянарнага гандлю, планіроўка і забудова паселішча больш складаная і разнастайная, адміністрацыйна мястэчка мае больш высокі статус [7, с.251]. Пры тым, што значная колькасць насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы, у цэлым у мястэчку спектр даступных прафесійных заняткаў шырэйшы, чым у вёсцы. Тут прадстаўлены рамяство, гандаль, пасрэдніцкая дзейнасць [2, с.43]. Многія даследчыкі адносяць мястэчка да катэгорыі гарадоў, падкрэсліваючы толькі іх невялікі памер – не больш за 300 дымоў [4, с.9].

Адна з вызначальных рыс мястэчка – поліэтнічнасць і поліканфесійнасць насельніцтва. Прывязка культавых аб'ектаў да планіровачнага ядра мястэчка – гандлёвай плошчы – атрымала назву "беларускі трохкутнік": царква – касцёл – сінагога, да якіх у некаторых мястэчках дадавалася таксама мячэць. У беларускіх мястэчках склаліся як мінімум два культурныя асяроддзі – яўрэйскае і беларускае, да якіх у многіх мястэчках яшчэ дадаваліся польскае і татарскае [9, с.5; 3, с. 43; 11, с.197].

Падсумоўваючы падыходы да азначэння, вядомая даследчыца мястэчак Беларусі Іна Соркіна прапаноўвае наступнае: “Мястэчкі мэтазгодна разглядаць як асобны тып паселішчаў, нятоесных ні вёсцы, ні гораду, які выконваў функцыі эканамічнага, адміністрацыйнага, камунікацыйнага, культурнага цэнтра параўнальна невялікіх сельскіх раёнаў, якія, як правіла, не мелі гарадоў. Мястэчкі арганічна спалучалі рысы і сельскіх, і гарадскіх паселішчаў. Гэта праяўлялася ў гаспадарчых занятках, структуры насельніцтва, архітэктуры […] Спецыфіка мястэчак у многім вызначалася гэтым скрыжаваннем горада і вёскі» [9, с.46].

У літаратуры, жывапісу, а нярэдка і гістарычных даследаваннях мястэчку адводзілася роля страчанага раю, чароўнага месца, дзе ўсе жылі ў міры і згодзе, і адкуль родам талерантнасць, разважлівасць і памяркоўнасць, якія прыпісваюцца беларусам. У пэўнай меры такая ідылічная карціна з'яўляецца вынікам міфалагізацыі вобраза мястэчка. Але ў любым выпадку мястэчкі – унікальны сацыякультурны феномен, які адыграў важную ролю ў гісторыі Беларусі.

Сярод розных нацыянальных абшчын мястэчак самымі буйнымі былі яўрэйскія. Яўрэі-ашкеназі перасяляюцца на землі Рэчы Паспалітай з XV-XVI стагоддзяў. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай адбываецца канчатковая крышталізацыя сацыякультурнай мадэлі мястэчка. У 1791 – 1794 гг. вызначаюцца тэрыторыі «мяжы

яўрэйскай аселасці», на ўсход ад якой яўрэям забаранялася сяліцца. Усходняя мяжа тэрыторый супадала з мяжой беларускіх губерняў. Далейшая палітыка царскага ўрада была накіравана на выцясненне яўрэйскага насельніцтва з сельскіх паселішчаў, што аказала вялікі ўплыў на развіццё мястэчак. Заканадаўча высяленне яўрэяў з вёсак было замацавана ў 1804 г. "Палажэннем аб яўрэях”, у якім апошнім забаранялася арандаваць шынкі, корчмы і пастаялыя двары ў вёсках і прадаваць там віно. Таксама забаранялася жыць у вёсках «пад якім бы то ні было выглядам, хіба праездам» [цыт. па 9, с.72]. У выніку колькасць гарадскога насельніцтва ў межах сучаснай Беларусі ўзрасла за 1786 - 1885 гг. у 7,5 разоў. У канцы XIX ст. ў 44 гарадах Беларусі яўрэі складалі 53,5% [5, с.118].

Адным з вынікаў Палажэння стаў рост колькасці мястэчак. Пераўтварэнні сёл у мястэчкі выкарыстоўваліся памешчыкамі як спосаб захаваць каля сябе яўрэйскае насельніцтва і даходы ад арэнды і пасрэдніцкіх паслуг. Статыстычныя матэрыялы па Віленскай губерні за 1861 год сведчаць, што з 189 зарэгістраваных мястэчак толькі 9 адпавядалі статусу мястэчка, астатнія былі не больш чым вёскамі, заселенымі яўрэямі [5, с. 704].

Следствам гвалтоўнага высялення яўрэяў з сельскай мясцовасці стала вялікая канцэнтрацыя іх у гарадах і мястэчках, што прыводзіла да значнай цеснаты, росту канкурэнцыі і збяднення насельніцтва. У той жа час вялікая колькасць яўрэяў у гарадах і мястэчках спрыяла кансервацыі тут яўрэйскай традыцыйнай культуры і ладу жыцця. Мястэчкі былі не проста населенымі пунктамі, характар, асаблівы стыль жыцця мястэчка вызначала яўрэйская абшчына, якая жыла замкнёна па законах Галахі. Абшчына непасрэдным чынам уплывала на жыццё кожнага свайго члена, прапаведуючы идишкайт (традыцыйныя яўрэйскія каштоўнасці) і меншлихкайт (гуманнасць) [10]. Лад жыцця, звычаі і традыцыі, у цэлым яўрэйская культура асацыююцца ў першую чаргу з мястэчкам або штэтлам, які разглядаецца як натуральнае яўрэйскае асяроддзе жыцця, як тыпова яўрэйскі гарадок.

І ў навуковай, і ў мастацкай літаратуры складваецца настальгічны дыскурс у дачыненні да штэтла як нейкага запаведнага ландшафта [8, с.34], замкнёнага і самадастатковага яўрэйскага мікракосму [6], малой яўрэйскай радзімы, свайго роду «Ізраіля ў выгнанні» [9, с.51], метанімічнага хранатопа згубленага свету ашкеназскіх яўрэяў [13]. Тэрмін «штэтл» быў уведзены ў шырокі зварот працай Э. Герцаг і М. Збароўскага «Жыццё з народам», дзе малюецца карціна ідэальнага месца, выключна яўрэйскае «натуральнае асяроддзе пражывання» [1].

Паняцці «штэтл» і «мястэчка» нярэдка выкарыстоўваюцца як сінонімы, што не зусім дакладна, паколькі ў гэтым выпадку ігнаруюцца беларускія, польскія, літоўскія ці ўкраінскія складнікі мястэчак. На самой справе мястэчак з чыста яўрэйскім насельніцтвам было вельмі мала, на тэрыторыі Беларусі гэта мястэчка Захарына Мсціслаўскага павета. У той жа час былі мястэчкі, дзе зусім не было яўрэйскага насельніцтва, напрыклад, м.Грэск, тут у першай палове XIX ст. не было зафіксавана ніводнага яўрэйскага двара [9, с. 47]. У сучаснай гістарыяграфіі штэтл разглядаецца не як ізаляванае асяроддзе, а як зона, якая злучае яўрэяў з хрысціянамі і яўрэяў з яўрэямі, зона інтэнсіўных міжэтнічных і міжрэлігійных кантактаў [6]. Іна Соркіна прапануе разглядаць штэтл як «яўрэйскую фізічную і духоўную прастору ў беларускім (польскім, украінскім, літоўскім) мястэчку», а наяўнасць штэтла называе галоўнай асаблівасцю беларускага мястэчка [9, с. 48].

Феномен мястэчка праяўляецца ў арганізацыі адзінай сацыяльнай і эканамічнай прасторы досыць камфортнага суіснавання розных этнасаў, культур і рэлігій у рамках невялікай супольнасці, дзе, фактычна, усе адзін з адным былі знаёмыя. Супрацоўніцтву і мірнаму суіснаванню шмат у чым садзейнічала адсутнасць эканамічнай канкурэнцыі з прычыны падзелу сфер дзейнасці паміж рознымі этнічнымі групамі. Хрысціянскае насельніцтва – беларусы і палякі – былі занятыя ў асноўным у сельскай гаспадарцы і рамястве, у першую чаргу – ганчарным. Татары займаліся агародніцтвам і вырабам скур. Гандлёвае прадпрымальніцтва, пасрэдніцкая дзейнасць, карчмарства, рамяство, транспарт было полем дзейнасці яўрэяў.

Такая спецыялізацыя забяспечвала не толькі адсутнасць канкурэнцыі, але і абавязковае супрацоўніцтва паміж этнічнымі групамі, паколькі прафесійная структура садзейнічала эканамічным кантактам і ўзаемадзеянню. Змітрок Бядуля пра беларусаў і яўрэяў напісаў: «Суседзтва гэтых двух нацый стварыла такія жыццёвыя і эканамічныя сувязі, у якіх адна нацыя без другой не магла абыйсціся» [3, с.24]. Узаемаадносіны паміж прадстаўнікамі розных этнічных груп характарызаваліся высокай ступеню талерантнасці, хоць гэта далёка не заўсёды азначала цесныя зносіны альбо блізкае сяброўства. Дыстанцыя паміж рознымі групамі была рознай, але яна заўсёды прысутнічала.

Найбольш складанай ў спалучэнні кантакту / дыстанцыявання была яўрэйская абшчына. Паколькі ў руках яўрэяў быў сканцэнтраваны гандаль, у значнай меры – рамяство, цалкам – медыцынская сфера, то фармальныя паўсядзённыя кантакты яўрэяў з іншымі групамі былі непазбежныя. Але сфера прыватнага жыцця была максімальна закрытай ад іншых груп.

Іна Соркіна, аналізуючы асаблівасці міжнацыянальных адносін у беларускіх мястэчках, азначае важнасць такога фактара, як адсутнасць ананімнасці вялікага горада. У рамках малага соцыума прыватнае жыццё кожнага было навідавоку, што спрыяла высокай ступені талерантнасці [9, с.226].

Мястэчкі – гэта сацыяльная, эканамічная і культурная прастора ўзаемадзеяння розных народаў, культур, рэлігій, сфер дзейнасці, спосабаў жыцця і традыцый. Феномен мястэчка рэалізаваўся ў арганізацыі сацыякультурнага асяроддзя, у якім, з аднаго боку, забяспечвалася функцыянаванне і развіццё этнаканфесійных культур, а з другога – іх актыўнае ўзаемадзеянне ў знешнім асяроддзі. Фактарам, які станоўча ўплываў на ўзровень талерантнасці і цярпімасці ў мультыкультурным грамадстве, была спецыялізацыя этнаканфесійных груп у розных галінах эканамічнай дзейнасці, што не стварала канкурэнтнага напружання паміж імі. Спецыфіка мястэчка праяўляецца ў тым, што амбівалентныя працэсы дыстанцыявання і ўзаемадзеяння адбываліся ў рамках вельмі невялікіх супольнасцяў, дзе, фактычна, усе былі адзін з адным знаёмыя. Адсутнасць ананімнасці, характэрнай для вялікіх гарадоў, таксама служыла фактарам, які ўплывае на імкненне да выбудоўвання адносін супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння.

Літаратура

1. Zborowski M., Herzog E. Life Is with People: The Culture of the Shtetl. – New York: Schocken Books, 1995.
2. Аляксандраў Г. Праграма вывучэння мястэчка // Наш край. – 1928. – № 2 (29). – С. 45 - 53.
3. Бядуля Зм. Жыды на Беларусі // ARCHE. – 2000. – № 3 (8). – С. 23 - 32.

4. Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. – Минск: “Наука и техника”, 1975. – 248 с.
5. Корево А. Материалы для географии и статистики России. Виленская губерния. – СПб., 1861. – 821 с.
6. Крутиков М. Штетл между фантазией и реальностью // НЛО. – 2010. - № 2 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа https://magazines.gorky.media/nlo/2010/2/shtetl-mezhdu-fantaziej-i-realnostyu.html. – Дата доступа: 11.12.2020.
7. Лакотка, А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. – Мінск: Ураджай, 1999. – 366 с.
8. Соколова А. Еврейские местечки памяти: локализация штетла // Штетл, XXI век: Полевые исследования. — СПб.: Издательство Европейского университета в Санкт-Петербурге, 2008 — С. 29 – 64.
9. Соркіна, І. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII -першай палове XIX ст. – Вільня: Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, 2010. – 488 с.
10. Школьникова Э. Трансформация еврейского местечка в СССР в 1930-е гг. – Москва, 1998. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа http://jhist.org/lessons_09/1930.htm. – Дата доступа: 11.12.2020.
11. Шыбека З. Гарады Беларусі : (60-я гады XIX - пачатак XX стагоддзяў). – Мінск: ЭўроФорум, 1997. - 292 с.
12. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве / Т.А.Навагродскі [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2009. – 335 с.
13. Ялен Д. "Так называемое "еврейское" местечко": штетл, большевистская идеология и советская этнография в межвоенный период // НЛО. – 2010. - № 2 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа https://magazines.gorky.media/nlo/2010/2/tak-nazyvaemoe-8220-evrejskoe-8221-mestechko-shtetl-bolshevistskaya-ideologiya-i-sovetskaya-etnografiya-v-mezhvoennyj-period.html. – Дата доступа: 11.12.2020.